МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
**Дзяржаўная ўстанова
«Заслужаны калектыў
Рэспублікі Беларусь
«РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР
БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ»**
вул. Крапоткіна, 44, 220002, г. Мінск
Тэл./факс: (017) 286 03 27, E-mail: tbd@tut.by
**УНП 100220213 АКПА 37365676
Р/р BY36AKBB30120000001995100000,
БИК/BIC SWIFT AKBBBY2X,
ЦБП 510 ААТ «ААБ Беларусбанк», г. Мінск, пр. Незалежнасці,56**

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫРЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
**Государственное учреждение
«Заслуженный коллектив
Республики Беларусь
«РЕСПУБЛИКАНСКИЙ ТЕАТР
БЕЛОРУССКОЙ ДРАМАТУРГИИ»**
ул. Кропоткина, 44, 220002, г. Минск
Тел./факс: (017) 286 03 27, E-mail: tbd@tut.by
**УНП 100220213 ОКПО 37365676
Р/с BY36AKBB30120000001995100000,
БИК/BIC SWIFT AKBBBY2X,
ЦБУ 510 ОАО «АСБ Беларусбанк», г Минск, пр.Независимости, 56**

17.01.2023 № 01-20/27
На № __________ ад ______________

Дзяржаўная ўстанова «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі» дзякуе за ўважлівасць і неабыякавасць да лёсу нашага тэатра і становішча беларускай драматургіі. Кіраўніцтва і ўвесь калектыў РТБД гэтаксама лічыць, што прасоўванне і папулярызацыя менавіта беларускай драматургіі – місія і асноўная задача нашага тэатра. У сваёй дзейнасці і фарміраванні рэпертуарнай палітыкі тэатр прытрымліваецца гэтага кірунку і робіць усё магчымае для прасоўвання і развіцця беларускай драматургіі.

Адказваючы на вашы пытанні мы:

1. Звяртаем вашу ўвагу на тое, што большасць спектакляў рэпертуару заснавана менавіта на творах беларускіх, а не замежных аўтараў:

- Драматург Андрэй Іваноў, якога вы аднеслі да расійскіх аўтараў, з’яўляецца беларускім драматургам.
- Акрамя тых імён, якія вы ўжо назвалі, хочацца нагадаць імёны Францішка Аляхновіча і Леапольда Родзевіча (спектакль “Адамавы Жарты”), Якуба Коласа, Элізы Ажэшкі, Змітрака Бядулі, Івана Мележа, Янкі Купалы і іншых аўтараў (спектакль “Беларусь. Дыдактыка”); Мікалая Матукоўскага (спектакль “Мудрамер”).
- Сярод спектакляў для дзяцей можна адзначыць пастаноўкі па творах беларускіх аўтараў – “Гісторыя двух сабак” Ягора Конева, “Залатое сэрцайка” Святланы Навуменка.
- Аўтарскія спектаклі Яўгена Карняга і Кацярыны Аверкавай “Пачупкі” і “Шлюб з ветрам” – праекты, цалкам заснаваныя на беларускім фальклоры. Гэтыя унікальныя пастаноўкі нясуць у сабе не толькі мастацкую каштоўнасць, але і вяртаюць у сучаснасць непаўторную і кранальную беларускую культурную спадчыну.
- Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі і Цэнтр беларускай драматургіі, які дзейнічае пры тэатры, робяць шмат дадатковых праектаў, накіраваных на падтрымку і развіцце сучаснай беларускай драматургіі. На сцэне тэатра праводзяцца сцэнічныя чытанні п’ес беларускіх аўтараў, а таксама праект “Тыдзень сучаснай беларускай драматургіі”. Штогод арганізоўваецца

Міжнародная драматургічная лабараторыя, на якой ствараюцца новыя п’есы. Ладзяцца семінары і прафесійныя майстар-класы, лекцыі і драматургічныя конкурсы.

2. Дзякуем за вашы прапановы. Мы абавязкова звернем на іх увагу.

Будзем рады бачыць вас на спектаклях і мерапрыемствах нашага тэатра, дзе вы зможаце больш падрабязна пазнаёміцца з нашым рэпертуарам.

Дырэктар С.В.Карукіна

Белякова 3523327